# З"ЕЗД ІНЖЫНЕРАЎ ЧАЛАВЕЧЫХ ДУШ

## З даклада нам.старшыні праўлення саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі тав.АЛЕКСАНДРОВІЧА.

## НОВЫ ЭТАП САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

Першы пісьменніцкі з"езд з"яўляецца падзеяй сусветнага значэння, і радасна аб гэтым гаварыць таму, што з"езд адбыўся і мог адбыцца толькі ў Савецкім Саюзе, толькі дзякуючы кіраўніцтву камуністычнай партыі і асабіста тав.Сталіна. Тав.Сталін сістэматычна клапатліва кіраваў справай літаратурнага руху. Ніхто іншы, як тав.Сталін, сфармуляваў сутнасць метаду савецкай літаратуры, сутнасць сацыялістычнага рэалізма, ніхто іншы, як тав.Сталін, ахарактарызаваў пісьменнікаў народаў Савецкага Саюза "інжынерамі чалавечых душ", раскрыў вялікія рэвалюцыйныя перспектывы савецкай літаратуры.

Усесаюзны з"езд пісьменнікаў адкрыў новы гістарычны этап у барацьбе за стварэнне новай культуры сацыялізма. І гэта новая культура сацыялізма загаварыла магутным голасам у дакладзе Алексея Максімавіча Горкага, у дакладах аб літаратуры брацкіх рэспублік, загаварыла магутнай сілай інтэрнацыянальнага адзінства, сілай пралетарскай дружбы народаў на славу партыі бальшэвікоў.

Пісьменнікі прышлі на свой выдатны з"езд з вялікімі творчымі поспехамі, маналітна спаяныя аднымі задачамі, адной імклівасцю. Гэта адзінства мэты, глыбока і кроўна ўсвядомленае пісьменнікамі ўсіх народаў Савецкага Саюза, падкрэслівае велізарнае значэнне з"езда, як дэманстрацыі адданасці шырокіх

мае савецкай інтэлігенцыі ідэям сацыялізма, як яркі паказ перамог генеральнай лініі партыі.

– У Савецкім Саюзе, як на з"ездзе выказаўся адзін таварыш, наша партыя дала пісьменніку ўсё, абсалютна ўсё правы і не дае пісьменніку аднаго толькі права – права дрэнна пісаць. Пад знакам барацьбы за якасць мастацкай літаратуры, на аснове лініі сацыялістычнага рэалізма, мы павінны даваць творы розныя па сваіх прыёмах, розныя па мастацкіх сродках, але аднолькавыя ў сваім імкненні, па сваёй класавай накіраванасці.

## ПОСПЕХ УСЁЙ РЭСПУБЛІКІ, УСЁЙ КП(б)Б

Літаратура Савецкай Беларусі вышла на з"езд з немалым творчым здабыткам. Што БССР атрымала ў літаратурную спадчыну? Вельмі небагата. Асноўны яе ўздым, рост і росквіт адбываецца выключна ў гады пралетарскай рэвалюцыі.

Літаратура Савецкай Беларусі – гэта творчая работа, новыя кнігі Купалы, Коласа – гэтых буйных майстроў слова, якія сёння, дзякуючы кіраўніцтву партыі, цвёрда стаяць на платформе савецкай улады, дзйна ўключыліся ў барацьбу за сацыялістычнае будаўніцтва.

Літаратура Савецкай Беларусі – гэта раманы, аповесці, паэмы і вершы Лынькова, Галавача, Чарота, Крапівы і Бядулі, Броўкі, Хведаровіча, Глебкі і Знаёмага, Чорнага, Гурскага, Мікуліча і Куляшова і цэлага раду іншых таварышоў.

Літаратура Савецкай Беларусі – гэта творчасць яўрэйскіх пісьменнікаў Харыка і Кульбака, Тэйфа, Камянецкага і іншых,

гэта творчасць польскіх пісьменнікаў Кавальскага, Гараўскага, РамаНоўскай і іншых.

Гэта вялікі дружны многагалосы калектыў - ён народжан у агні пралетарскай рэвалюцыі, у барацьбе рабочага класа за будаўніцтва сацыялізма. Маналітнасць, імкненнасць, дружба, кансалідацыя дасягнуты дзякуючы ўпартай рабоце пісьменнікаў-камуністаў на літаратурным фронце, якія сваім ідэйным і творчым ростам заваявалі права быць у першых вядучых радах.

Выступленні нашых беларускіх дэлегатаў на з"ездзе, на заводах і фабрыках, у Зялёным тэатры, дзе прысутнічала звыш 20.000 рабочых горада Масквы, наша сустрэча з членамі Палітбюро ЦК у Максіма Горкага, з адказнымі работнікамі "Правды", потым наша пісьмо правадыру і настаўніку, лепшаму другу савецкай літаратуры - Іосіфі Вісарыёнавічу Сталіну - гэта не толькі нашы заваяванні, гэта не толькі наш поспех, гэта поспех працоўных усёй нашай рэспублікі, гэта поспех партыі бальшэвікоў Савецкай Беларусі.

## РАСЦЕ КУЛЬТУРНАСЦЬ ШЫРОКІХ МАС.

Сіла і значэнне з"езда настолькі вялікія, што сіла зацікаўленасці ім нікольки не аслабла і зараз.

Рост культуры шырокіх мас бясспрэчны. Гэта відаць па той чытабельнасці кніг у нашых бібліятэках, калі, каб атрымаць для чытання добрую кнігу, утвараецца чарга. Гэта відаць у нашых тэатрах, калі на добры спектакль цяжка атрымаць білет, гэта відаць у нашых кінотэатрах, калі поўным-поўна валіць народу на добры фільм, гэта відаць па сетцы нашых школ і па

характару клубнай работы. Расце масавы літаратурны рух, вялікая цяга моладзі ў літаратуру.

На буйных прадпрыемствах у нас ёсць літаратурныя гурткі. Па шчырасці сказаць, гурткі нашы працуюць яшчэ вельмі і вельмі дрэнна. Ім не дапамагаюць так, як гэта трэба.

Галоўным чынам, мы павінны падкрэсліць, што работу літгурткоўцаў недаацэньваюць нашы парткомы і фабкомы на прадпрыемствах. Часамі работа літаратурных гурткоў не ўключаецца ў агульны план работы завода. Літгуртку няма той увагі, якая аддаецца любой іншай грамадскай арганізацыі на прадпрыемстве. А мы павінны дабіцца таго, каб старшыня фабкома, робячы справаздачу перад рабочымі аб рабоце мопраўскай ячэйкі, аб рабоце Асоавіяхіма, - у такой-жа ступені адказваў за работу літаратурнага гуртка.

Калі мы работу так паставім, мы будзем мець у нашай літаратуры і ў бліжэйшыя часы новых прадстаўнікоў талантлівых, з гушчы рабочага класа.

## ЗА ВЫСОКУЮ КУЛЬТУРУ МОВЫ.

Мы ў Савецкай Беларусі за гады пралетарскай рэвалюцыі дасягнулі такіх вялікіх заваяванняў, для якіх проста нельга знайсці крытэрыя для таго, каб параўнаць з тым, што было.

Мы зараз у Савецкай Беларусі за адзін год выдаем у 16 раз больш кніг, чым выдана на беларускай мове за ўсе стагоддзі да Окцябрскай рэвалюцыі усімі выдавецтвамі і ўсімі краінамі. Гэта вялікі паказальнік нашага культурнага росту.

Беларускія нацдэмы шкодзілі на ўсіх участках нашага жыцця. Яны ўсюды імкнуліся падрываць фундамент сацыялістычнага будаўніцтва. Шкодзілі яны і на фронце літаратуры і мовы. Пад кіраўніцтвам нашай партыі мы з усёй ярасцю змагаліся з беларускай контррэвалюцыяй і ў гэтай барацьбе нашы кадры ідэйна ўмацаваліся.

У мінулым годзе спецыяльнай пастановай СНК у Савецкай Беларусі ўведзен новы правапіс. Гэта вялікі паказальнік нашага росту, нашай крэпасці. Новы правапіс з"яўляецца дэманстрацыяй таго, што мы ствараем сваю культуру пад сцягам пралетарскага інтэрнацыяналізма, гэта з"яўляецца паказальнікам таго, што мы пад кіраўніцтвам партыі будуем новую беларускую савецкую культуру.

Аднак, некаторыя недаацэньваюць гэтага сур"ёзнейшага, буйнейшага факта і не хочуць авалодаць новым правапісам (хоць ён і вельмі нескладаны) і часам пішуць зусім няграматна. Мы з"яўлянмся перадавымі людзьмі, а часта пішам няграматна, часта гаворым няграматна, не сочым за сваёй мовай. Калі гаворыш на рускай мове, то трэба гаварыць абсалютна граматна па-руску, а калі гаворыш на беларускай мове, то трэба гаварыць абсалютна правільна па-беларуску. Гэта патрабаванне зусім законна пастаўлена перад намі і ўсе мы павінны змагацца за культуру і далейшае ўдасканаленне мовы.

У канцы свайго даклад тав.Александровіч прыводзіць рад яркіх фактаў, сцвярджаючых неабходнасць рашуча змагацца за культуру, яшчэ шырэй і глыбей разгортваць фронт ленінскай культурнай рэвалюцыі.

"Звязда",1934,28-IX,№ 217.